


РАЗДЗЕЛ IV

# БССР У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 1940-х — 1980-я гг.

## § 19. Грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове 1940-х — першай палове 1960-х гг.

***Успомніце.*** **1.** Якімі былі галоўныя прыметы савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў БССР у канцы 1920-х—1930-я гг.
**2.** Што ўяўляў сабою культ асобы І. В. Сталіна?

***Вучэбная задача.*** Вызначыць характэрныя рысы грамадска-палітычнага жыцця ў БССР у другой палове 1940-х — першай палове 1960-х гг.

**Асаблівасці пасляваеннага ўнутрыпалітычнага жыцця ў БССР.** Пасля перамогі над нацысцкай Германіяй узрасло пачуццё ўласнай годнасці беларускага народа. Людзі спадзяваліся, што іх роля ў вырашэнні грамадскіх спраў узрасце. У насельніцтва ўзнікалі спадзяванні на перамены ў палітычным жыцці. Аднак для ўлады галоўным было захаванне той палітычнай сістэмы, што склалася ў даваенныя гады.

№ 12

Кіраўніцтва краіны з пэўным недаверам ставілася да насельніцтва, што жыло на акупаванай тэрыторыі, а таксама да былых палонных, бежанцаў і перасяленцаў, якія вярталіся на радзіму. Улада лічыла, што гітлераўская прапаганда на акупаванай тэрыторыі і сярод тых, хто быў вывезены ў Германію, паспела сфарміраваць у часткі насельніцтва антысавецкія настроі і недавер да Камуністычнай партыі.

Своеасаблівa складвалася пасляваенная сітуацыя ў заходнім рэгіёне Беларусі. Тут пераважалі аднаасобныя сялянскія гаспадаркі, уладальнікаў якіх прымусова запісвалі ў калгасы, што выклікала незадавальненне. Органамі дзяржбяспекі ў 1947 г. быў выкрыты шэраг падпольных моладзевых арганізацый на тэрыторыі Заходняй Беларусі, удзельнікамі якіх былі ў асноўным беларускія настаўнікі і навучэнцы. Яны ўздымалі пытанні захавання і развіцця роднай культуры, мовы. Дзейнасць гэтых арганізацый разглядалася ў той час як антысавецкая, а іх удзельнікі былі асуджаны (**1).



Правообладатель Издательский центр БГУ

У пасляваенныя гады ў БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, працягваліся палітычныя рэпрэсіі, існаваў культ асобы І. В. Сталіна. Адзіная Камуністычная партыя ажыццяўляла як палітычныя, так і адміністрацыйныя функцыі. Першым сакратаром Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі ў 1938—1947 гг. быў Панцеляймон Кандратавіч Панамарэнка. Структурнымі элементамі тагачаснай грамадска-палітычнай сістэмы з'яўляліся Саветы дэпутатаў працоўных. У адпаведнасці з Канстытуцыяй БССР 1937 г. ім належалі функцыі дзяржаўнага кіравання і арганізацыі грамадскага жыцця. Аднак Саветы поўнасцю знаходзіліся пад кантролем партыі і рэальнай улады не мелі. Выбары ў Саветы праводзіліся на безальтэрнатыўнай аснове. Кандыдаты, якіх прапаноўвалі для выбрання, папярэдне зацвярджаліся партыйнымі органамі. За вылучанага кандыдата аддавалі свае галасы заўсёды больш за 99 % выбаршчыкаў.

*Папрацуйце, выкарыстоўваючы прыём ключавога слова, са зместам гэтага абзаца. Звярніцеся да адпаведнай метадычнай парады на с. 178.*




Савецкі плакат. Мастак *Л. П. Замах.* 1946 г.




Савецкі плакат. Мастакі *Я. М. Тарас, М. Ц. Гуціеў, Л. П. Замах.* 1950 г.

*Вызначце, выкарыстоўваючы савецкія палітычныя плакаты, пра якую грамадска-палітычную з'яву яны сведчылі і чаму кандыдаты ў Саветы дэпутатаў працоўных абіраліся амаль аднагалосна.*

У грамадска-палітычным жыцці важную ролю адыгрываў Ленінскі Камуністычны саюз моладзі Беларусі (ЛКСМБ). У 1945 г. за мужнасць, праяўленую камсамольцамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, ЛКСМБ быў узнагароджаны ордэнам Баявога

Правообладатель Издательский центр БГУ

Чырвонага Сцяга. Камсамол з'яўляўся масавай арганізацыяй, што аб'ядноўвала большасць маладых людзей ва ўзросце ад 14 да 28 гадоў, якія працавалі або вучыліся. Ад камсамольцаў патрабаваліся ўзорная праца і добрасумленная вучоба, адданасць ідэям Камуністычнай партыі, актыўнасць жыццёвай пазіцыі. Большасць з іх успрымалі сваю дзейнасць як служэнне Радзіме. Таму энтузіязм і натхненне былі адметнай рысай камсамольскага жыцця.

У пасляваенны час у Беларусі ў дзяржаўнай палітыцы больш прыкметнымі сталі тэндэнцыі верацярпімасці. Гэта праявілася ў павелічэнні колькасці праваслаўных прыходаў, цэркваў і святароў. Аднаўленне царкоўнага жыцця стала магчымым дзякуючы ўдзелу святароў у барацьбе з ворагам у час Вялікай Айчыннай вайны.



Дзяржаўны сцяг БССР у 1951—1991 гг.

*Вызначце, што сімвалізуюць элементы Дзяржаўнага сцяга БССР.*

**Дзяржаўная сімволіка БССР.** Унёсак у барацьбу са смяротна небяспечным ворагам, якім з'яўлялася нацысцкая Германія, быў адзначаны выхадам БССР на міжнародную арэну ў якасці адной з дзяржаў — заснавальніц ААН (**2). У сувязі з гэтым у 1951 г. адбылося зацвярджэнне новага Дзяржаўнага сцяга рэспублікі. Малюнак сцяга распрацаваў мастак М. Гусеў. Узор беларускага нацыянальнага арнаменту быў узяты з ручніка, вышытага ў 1917 г. сялянкай Матронай Маркевіч з в. Касцілішча, што на Віцебшчыне. Дзяржаўны сцяг у такім выглядзе існаваў да 1991 г.

Даволі доўга БССР не мела свайго дзяржаўнага гімна. У пасляваенныя гады ў якасці яго выкарыстоўваўся гімн СССР, зацверджаны ў 1943 г. Ён служыў сімвалам яднання розных народаў у шматнацыянальнай дзяржаве. У 1955 г. на пасяджэнні Вярхоўнага Савета БССР быў зацверджаны Дзяржаўны гімн БССР, які існаваў да 1991 г. Яго аўтарамі сталі паэт Міхась Клімковіч і кампазітар Нестар Сакалоўскі. Іх патрыятычная песня «Мы — беларусы» перамагла сярод іншых музычных твораў у конкурсе на стварэнне Дзяржаўнага гімна БССР:

*Вызначце, якія асаблівасці гістарычнага шляху беларускага народа і грамадска-палітычнага жыцця краіны ўвасобіў Дзяржаўны гімн БССР.*

*Мы — беларусы з братняю Руссю*
*Разам шукалі к шчасцю дарог,*
*Ў бітвах за волю, ў бітвах за долю*
*З ёй здабылі мы сцяг перамог!*

*Нас аб'яднала Леніна імя,*
*Партыя к шчасцю вядзе нас ў паход.*
*Партыі слава! Слава Радзіме!*
*Слава табе, Беларускі народ!*



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Змены ў грамадска-палітычным жыцці ў другой палове 1950-х — першай палове 1960-х гг.** Пасля смерці І. В. Сталіна ў 1953 г. унутрыпалітычнае становішча стала пакрысе змяняцца. Спыніліся масавыя палітычныя рэпрэсіі. Пачалася частковая **рэабілітацыя** — аднаўленне добрага імя і правоў нявінна асуджаных у папярэднія гады. Па ініцыятыве Першага сакратара Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза (ЦК КПСС) М. С. Хрушчова характар сталінскага палітычнага рэжыму быў прызнаны рэпрэсіўным, а культ асобы Сталіна асуджаны.

Перыяд з другой паловы 1950-х гг. па першую палову 1960-х гг. атрымаў назву **«адліга»**. У гэты час пасаду кіраўніка Камуністычнай партыі Беларусі заняў К. Т. Мазураў.

**Кірыла Трафімавіч Мазураў** (1914—1989). Ураджэнец Гомельшчыны. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны і арганізатар партызанскага руху на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Разам з партызанамі, нягледзячы на тое што меў званне падпалкоўніка, жыў у цеснай зямлянцы пасярод палескіх балот, еў простую зацірку, для смаку прыпраўленую калійнай соллю, бо звычайнай не было. Быў двойчы паранены. Стаў першым пасляваенным кіраўніком камсамола Беларусі. Старшыня Савета Міністраў БССР у 1953—1956 гг. Першы сакратар ЦК КПБ у 1956—1965 гг. Пад яго кіраўніцтвам партыйная арганізацыя Беларусі ажыццяўляла меры па пераадоленні наступстваў культу асобы Сталіна і рэабілітацыі ахвяр неабгрунтаваных палітычных рэпрэсій. Атрымаў званне Героя Сацыялістычнай Працы. К. Т. Мазураў валодаў адной з самых яскравых рыс нацыянальнага характару беларусаў — не прымаў неабдуманых рашэнняў. Усе рашэнні, прынятыя ім, дагэтуль успрымаюцца як абгрунтаваныя і паслядоўныя. Яму належала ідэя стварэння мемарыяльнага комплексу, прысвечанага Хатыні. На пытанне пра галоўную ісціну свайго жыцця адказваў так: «Не можа быць чалавеку добра, калі яго Радзіме дрэнна».



К. Т. Мазураў (злева) на пасяджэнні сесіі Генеральнай асамблеі ААН разам з К. В. Кісялёвым. 1960 г. (**3)

Пасля смерці К. Т. Мазурава родныя знайшлі лісток з запаветам унуку: «Будзь верны Айчыне — здрады яна не даруе».

*Як вы ставіцеся да выказанай К. Т. Мазуравым жыццёвай ісціны і яго запавету свайму ўнуку?*

Правообладатель Издательский центр БГУ

У 1961 г. была прынята Праграма КПСС, у якой вызначалася мэта пабудаваць камунізм у СССР у пачатку 1980-х гг. Камунізм разглядаўся як найвышэйшая ступень развіцця грамадства, для якой характэрныя грамадская ўласнасць, роўнасць людзей, сацыяльная справядлівасць, народаўладдзе, гуманізм. Аднак курс на хуткае будаўніцтва камунізму аказаўся неажыццяўляльным.

Лічылася, што паспяховы рух да камунізму стрымліваюць рэлігійныя перажыткі. Пад лозунгам іх хутчэйшага пераадолення ўладамі ажыццяўляўся націск на вернікаў. Былі зачынены многія храмы і манастыры. Аднак падобныя дзеянні не давалі чаканага масавага скарачэння колькасці вернікаў. Ініцыятыва партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР аб ператварэнні Беларусі ў першую «бязбожную» рэспубліку ў Савецкім Саюзе засталася нерэалізаванай.

Такім чынам, у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе ў БССР захоўвалася аднапартыйная грамадска-палітычная сістэма, якой былі ўласцівы працяг палітычных рэпрэсій і існаванне культу асобы. Здабыткамі «адлігі» ў другой палове 1950-х — першай палове 1960-х гг. сталі развянчанне культу асобы І. В. Сталіна і частковая рэабілітацыя рэпрэсаваных.

***Новыя паняцці і тэрміны****: рэабілітацыя, «адліга».*

****1.** Удзельнікі падпольнай моладзевай непалітычнай арганізацыі «Саюз беларускіх патрыётаў», створанай студэнтамі Глыбоцкага і Пастаўскага педагагічных вучылішчаў і вучнямі мясцовых школ, у сваіх успамінах занатавалі: «…Пасля вайны паступіў у педвучылішча ў Глыбокім. З нас рыхтавалі вясковых настаўнікаў пачатковых класаў. Аднак тут па-беларуску ўжо выкладалі толькі нашу мову, літаратуру ды педагагічную методыку. …Тады мы і стварылі „Саюз беларускіх патрыётаў“. Наша арганізацыя ў асноўным была ў абарону мовы. Мы, будучыя вясковыя настаўнікі, найперш выхоўвалі самі сябе, каб кожны размаўляў па-беларуску, а пасля нёс асвету ў народ… Мы ж былі яшчэ дзеці. А перад намі такая махіна — СССР!

Мы — ідэйныя людзі. І, калі б можна было пачаць жыццё спачатку, ад сваіх ідэалаў не адмовіліся б…»

«…Прымаем прысягу…: „Я, уступаючы ў Саюз беларускіх патрыётаў, прысягаю перад Бацькаўшчынай і беларускім народам, што заўсёды буду верны ідэалам свабоды і незалежнасці Беларусі…“. …Нам не было страшна прыносіць тую прысягу. Мы лічылі, што абавязаны гэта рабіць…»

У лютым 1947 г. удзельнікі арганізацыі былі арыштаваны і пакараны паводле артыкула Крымінальнага кодэкса БССР «Здрада Радзіме і ўдзел у антысавецкай арганізацыі» на тэрміны ад 10 да 25 гадоў лагераў. Рэабілітаваны ў 1990-я гг.

*Вызначце, у чым заключаліся ідэалы ўдзельнікаў Саюза беларускіх патрыётаў.*



Правообладатель Издательский центр БГУ

**2. Кіраўніком савецкай дэлегацыі на канферэнцыях па стварэнні Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і прыняцці яе Статута з'яўляўся ўраджэнец Гомельшчыны **Андрэй Андрэевіч Грамыка** (1909—1989). У 1946—1948 гг. — пастаянны прадстаўнік СССР у Савеце Бяспекі ААН. Яму належыць важная роля ў вырашэнні пытання аб уключэнні БССР у склад дзяржаў — заснавальніц ААН, а яго подпіс стаіць пад Статутам ААН. З канца 1940-х гг. А. А. Грамыка больш за 20 разоў у інтарэсах СССР выкарыстоўваў права вета (галасавання супраць) у Савеце Бяспекі ААН. За гэта атрымаў у заходнім дыпламатычным асяроддзі, а затым і ў прэсе імя «Містар Не». Грамыка ставіўся да гэтай мянушкі дабрадушна. Неяк ён сказаў: «Мае „не" яны чулі нашмат радзей, чым я іх „ноў", бо мы рабілі нашмат болей прапаноў». У 1957—1985 гг. А. А. Грамыка з'яўляўся міністрам замежных спраў СССР. Працуючы на гэтай пасадзе, заяўляў: «Я сабою маніпуляваць не дазваляў. Хто імкнуўся да гэтага, жадаў маніпуляваць СССР. Мы — вялікая дзяржава і нікому гэтага рабіць не дазволім!» А. А. Грамыка прытрымліваўся думкі, што лепш дзесяць гадоў перамоў, чым адзін дзень вайны. У Гомелі ўстаноўлены бюст нашага славутага земляка, а яго найважнейшыя дыпламатычныя прынцыпы складаюць ядро сучаснай знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь.



А. А. Грамыка з сям'ёй. 1940-я гг.

*Выкажыце ўласнае стаўленне да прынцыпаў знешнепалітычнай дзейнасці, якіх прытрымліваўся А. А. Грамыка.*

**3. Ураджэнец Магілёўшчыны **Кузьма Венядзіктавіч Кісялёў** (1903—1977) займаў у 1944—1966 гг. пасаду народнага камісара (потым міністра) замежных спраў БССР. У перыяд пасляваенных палітычных рэпрэсій аднойчы раніцай ён не застаў на месцы адказных работнікаў свайго міністэрства. Усе яны былі напярэдадні ноччу арыштаваны па абвінавачванні ў шпіянажы на карысць замежных краін. Ён дамогся асабістай сустрэчы з І. В. Сталіным, каб выратаваць сваіх беспадстаўна арыштаваных супрацоўнікаў. К. В. Кісялёў ахарактарызаваў іх як сумленных і верных камуністаў, франтавікоў і папрасіў разабрацца ў прычынах арышту. На гэта Сталін прапанаваў набраць новых спецыялістаў і працаваць з імі. Разумеючы, што выратаваць сваіх невінаватых падначаленых не атрымоўваецца, К. В. Кісялёў асабіста паручыўся за кожнага з іх, бо яны маглі загінуць. Сталін, падумаўшы, адказаў так: «Калі вы за іх ручаецеся, то сядайце за стол і пішыце заяву на маё імя, што ручаецеся, і спіс, за каго. Хочаце — пішыце, калі не — ад'язджайце ў Мінск». Кісялёў напісаў заяву, у якой пералічыў усіх сваіх арыштаваных супрацоўнікаў. Калі ён прыехаў у Мінск і наступнай раніцай прыйшоў у міністэрства, усе яго падначаленыя былі на месцы.

1. *У чым выявіліся сумленнасць і чалавечая годнасць К. В. Кісялёва?*
2. *Як бы вы дзейнічалі ў такой сітуацыі? Свае адказы растлумачце. Звярніцеся да метадычнай парады «Як мадэляваць свае паводзіны ва ўмоўнай гістарычнай сітуацыі» на с. 179.*

Правообладатель Издательский центр БГУ

1. Ахарактарызуйце прыметы савецкай грамадска-палітычнай сістэмы ў БССР у пасляваенны перыяд.
2. Растлумачце, чаму перыяд у грамадска-палітычным жыцці БССР другой паловы 1950-х — першай паловы 1960-х гг. назвалі «адлігай».
3. Чаму ў жыцці беларускай савецкай моладзі вызначальную ролю адыгрываў камсамол?
4. У чым заключалася значэнне рэабілітацыі рэпрэсаваных?

## § 20. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў другой палове 1940-х — першай палове 1960-х гг.

***Успомніце.*** **1.** Што такое пяцігодка?
**2.** Што ўяўлялі сабой калектывізацыя сельскай гаспадаркі і раскулачванне?

***Вучэбная задача.*** Вызначыць, якім чынам сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР садзейнічала фарміраванню індустрыяльнага грамадства.

**Пераадоленне наступстваў вайны ў галіне эканомікі. Курс на апераджальны рост цяжкай прамысловасці.** У выніку ваенных разбурэнняў і злачынстваў германскіх захопнікаў беларускі народ страціў звыш паловы нацыянальнага багацця. Былі спалены і зруйнаваны больш за 200 гарадоў і гарадскіх пасёлкаў, звыш 9 тысяч вёсак. Калі войскі Чырвонай Арміі 26 чэрвеня 1944 г. вызвалілі Віцебск, у горадзе засталося ўсяго 118 жыхароў, а да вайны іх было не менш як 180 тысяч. Прамысловыя прадпрыемствы і беларуская чыгунка былі амаль поўнасцю знішчаны. Паводле ўспамінаў мінчан, у цэнтральных раёнах горада пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх акупантаў захаваліся неразбуранымі ўсяго каля 70 будынкаў. У іх ліку — Дом Урада, Дом Чырвонай Арміі, Тэатр оперы і балета, пабудаваныя ў даваенны час па праектах архітэктара І. Лангбарда. Паўставала нават пытанне пра перанос сталіцы БССР у Магілёў.



Мінск. Руіны на плошчы Леніна (цяпер плошча Незалежнасці). 1945 г.



Правообладатель Издательский центр БГУ